Нефармат



# СВЯТОЧНЫ НАСТРОЙ

**Гэтым разам упершыню пасля пакупкі вясковага дома мы святкавалі Вялікдзень у вёсцы. Раней не выпадала: то было халаднавата — дачны сезон яшчэ не распачыналі, а ехаць у настылую за зіму хату не вельмі хацелася; то сабрацца ўсёй сям'ёй удавалася бліжэй да вечара суботы. Куды ўжо будзеш выпраўляцца?**

А цяпер, калі сёлетняя незвычайная вясна падарыла надвор'е, якое не заўсёды і на Тройцу бывае, як тут уседзіш у гарадской кватэры? У нас ужо адцвілі сады, толькі суседскі агрamadны куст бэзу радуе насычаным водарам, а на падворку другога суседа пакрываецца белымі суквецціямі высокі каштан. Шпакі цэлай чарадой шпацыруюць па скошанай на падворку траве, пэўна, у пошуках тлустых і смачных кузурак. Буслы выседжваюць нашчадкаў. Адным словам, адчуванне мяжы вясны і лета.

Праўда, усе кругом гавораць, што гэтае цяпло без пары нічога добрага не абяцае, яно яшчэ можа абярнуцца нечаканым, таксама без пары, маразам, і нарабіць шкоды. Як той казаў, пажывём — убачым, няма сэнсу гадаць. А пакуль што бясстрашна выпускае сваю лістоту вінаградны куст, які звычайна пакрываецца зяленінай толькі ў пачатку чэрвеня. І на градзе да святочнага стала мы ўжо нарвалі рукалы, шпінату, радыскі, і выраслі яны ў адкрытым грунце. А бульбу, што толькі ўзышла на другой градзе, апанавалі каларадскія жукі і паспелі нават адкласці лічынкі. Сусед кажа, што так рана гэтых адвечных бульбяных шкоднікаў ён не бачыў за ўсё жыццё. Клубніцы зацвілі таксама рана. Магчыма, цяпер усё будзе нашмат раней, можа, і восень, зіма будуць таксама раннія.

А вось салавей заспяваў у сваю пару. Цяпер штовечар, ды і ранкам можна слухаць гэтыя чароўныя салаўіныя канцэрты, яны і стварылі асаблівы святочны настрой. Ну і, вядома, асноўныя велікодныя традыцыі мы пастараліся захаваць. Праўда, у мяне гэта атрымліваецца не так удала, як было некалі ў мамы, калі яна ў чаканні нас тры дні рыхтавалася, гатавала ўсялякую смакату. Цяпер мы больш разлічвалі на прапановы гандлю і харчовай прамысловасці. Але ж і самі нешта прыгатавалі, напрыклад любімыя ўсімі салаты, а індычыныя ножкі запяклі ў печы, атрымалася вельмі смачна.

Галоўнымі атрыбутамі велікоднага абеду, як вядома, з'яўляюцца яйкі і кулічы, апошнія ў нашай мясцовасці заўсёды называлі булкамі. Яйкі хораша пафарбаваліся ў адвары цыбульнага шалупіння, якое назбіралі яшчэ пры пасадцы дамашняй цыбулі. Пры гэтым згадалася, як некалі вясковыя жанчыны дзяліліся такой фарбай. Суседка цётка Вера заўсёды брала ў мамы чыгун з адварам, казала, што ў яе вельмі прыгожае адценне атрымліваецца. А цяпер мне пазваніла пляменніца з прапановай узяць адвар, бо ў яе гэтым разам выйшла амаль «як у бабулі». Яна не ведала, што мы не ў горадзе і ўжо самі ўсё прыгатавалі. Мне, дарэчы, па «Вайберы» даўняя знаёмая раптам скінула рэцэпт фарбавання яек у чырвоным віне. Але ў мяне яны ўжо былі гатовыя, і да эксперымента гэтым разам не дайшло.

А вось булкі я ўжо шэраг гадоў замаўляю ў адной індывідуальнай прадпрымальніцы, якая вельмі любіць сваю справу і пячэ смачныя кулічы па рэцэптах яшчэ сваёй бабулі. Атрымліваецца сапраўды дамашні прадукт, у якім, несумненна, шмат калорый, але ён варты таго, каб паласавацца ў свята. Праўда, цяпер і гандлёвыя арганізацыі прапануюць вялікі асартымент такіх вырабаў. Мае суседзі загадзя накупілі булак розных памераў ад розных вытворцаў. І мы ўсёй вуліцай дружна накіраваліся асвяціць велікодную ежу.

Вёска, у якой знаходзіцца наш дом, даволі аддаленая ад царквы, тут пражывае шмат сталых людзей, таму ўжо некалькі гадоў святар прыязджае днём у суботу, каб асвяціць, як тут кажуць, пасху. Каля крыжа збіраецца добрая палова населенага пункта, пераважна жанчыны, з прыезджымі дзецьмі-ўнукамі. Ну і мы, дачнікі, гэтым разам прысусědзіліся. Для карэнных жыхароў такая сустрэча яшчэ і нагода ўбачыцца ўсім разам, даведацца пра навіны, пачуць, хто з унукаў паступіў вучыцца, хто пайшоў у армію альбо ажаніўся, ну і не без таго, вядома, згадаць, хто памёр. І такія паведамленні, на жаль, прагучалі. Паўспаміналі, пабедавалі. Нездарма ж вяскоўцы збіраюцца загадзя, задоўга да прызначанага часу... Потым прыехаў святар, пасля абавязковай малітвы і асвячэння нагадаў пра асноўны сэнс свята, сказаў, як трэба яго адзначаць, запрасіў тых, хто маладзейшы і актыўны, далучыцца да вячэрняй службы ў царкве.

Ну і самае галоўнае, святкаванне тут зусім не тое, што ў гарадской кватэры, калі проста сядзіш за сталом у сямейным саставе, а фонам — тэлевізар. Стол накрылі на свежым паветры, пад спеў птушак і водар бэзу згадалі, як ездзілі да мамы і бабулі. А яшчэ я расказала дзецям, як мой дзед на любое свята благаславіў сям'ю словамі: «Каб усе прычакаліся другога Вялікадня (альбо Каляд)» — у залежнасці ад таго, што адзначалі. Праз гады і дзесяцігоддзі гэта выглядае самым правільным і галоўным пажаданнем, у якім падразумяваецца і жыццё, і здароўе, і пэўная стабільнасць. Тым больш што мы на парозе яшчэ аднаго свята — Дня Перамогі, якое служыць напамінам пра каштоўнасць міру як гарантыі ўсіх апісаных вышэй клопатаў і прыгатаванняў, збору ўсёй сям'і на фоне квітнеючага бэзу, салаўіных песняў з адвечнымі велікоднымі атрыбутамі, віншаваннямі ўсіх сваякоў, добрых сяброў, знаёмых, якія раптам вырашылі пра сябе нагадаць. Хочацца, каб так і было налета, праз год, два і болей, як дзед казаў: «Каб прычакаліся».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.19 | 20.54 | 15.35 |
| Віцебск — | 5.03 | 20.49 | 15.46 |
| Магілёў — | 5.09 | 20.44 | 15.35 |
| Гомель — | 5.12 | 20.35 | 15.23 |
| Гродна — | 5.35 | 21.09 | 15.34 |
| Брэст — | 5.42 | 21.03 | 15.21 |

### Месяц

*Маладзік у 6.21. Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

**Пр.** *Марка, Сільвестра, Сяргея.*
**К.** *Лізы, Віктара, Міхаіла, Пятра, Станіслава.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## ЗАЎТРА




## 8 МАЯ

Даты | Падзеі | Людзі

**У краіне**



**1883** год — нарадзіўся Сцяпан Некрашэвіч, беларускі мовазнаўца, грамадскі дзеяч, ініцыятар стварэння і першы старшыня Інстытута беларускай культуры, акадэмік і віцэ-прэзідэнт Беларускай акадэміі навук, адначасова — дырэктар Інстытута мовазнаўства БелАН. Апублікаваў больш як 30 навуковых прац, у тым ліку чатыры манаграфіі і слоўнікі. Аўтар першага пасляпрэвалюцыйнага «Беларускага лемантара», школьнай чытанкі «Роднае слова», суаўтар буквара для ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых «Наша сіла — ніва ды машына».

**1944** год — адбыўся бой партызан брыгады імя Сталіна супраць нямецка-фашысцкіх карнікаў каля вёскі Целяшэвічы Дзяржынскага раёна, які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Целяшэвіцкі бой. Страты гітлераўцаў у гэтым баі склалі 41 чалавек забітымі, 42 былі паранены. Партызаны страцілі забітымі і паранёнымі 11 чалавек. Сярод загінулых — сакратар Івянецкага падпольнага райкама ЛКСМБ П. Турчаненка.

**1985** год — на праспекце Машэрава (сёння — праспект Пераможцаў) адкрыты архітэктурна-мемарыяльны комплекс «Мінск — горад-герой».

**У свеце**



**1828** год — нарадзіўся Жан Анры Дзюнан, швейцарскі прадпрымальнік і грамадскі дзеяч. У 1859 годзе ён стаў відавочцам наступстваў бітвы пры Сальферына (самай крывавай бітвы аўстра-італа-французскай вайны). Узрушаны ўбачаным, Дзюнан напісаў кнігу «Успаміны пра бітву пры Сальферына» і пачаў стварацьтаварыства дапамогі параненым. Дзякуючы яго намаганням быў заснаваны Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа і ў 1864 годзе прынятая першая Жэнеўская канвенцыя аб паляпшэнні долі параненых у сухапутнай вайне. У 1901 годзе разам з Фрэдэрыкам Пасі стаў першым лаўрэатам Нобелеўскай прэміі міру.

**1886** год — упершыню была выраблена Coca-cola, безалкагольны газіраваны напой.

**1965** год — Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР зацверджана Палажэнне аб ганаровым званні «Горад-герой». Гэта — найвышэйшая ступень адзнакі, якая прысвойвалася гарадам за масавы гераізм і мужнасць яго абаронцаў, праяўленыя ў Вялікай Айчыннай вайне.

Так гаварыў...

**МАЙК ТАЙСАН:**

*«Калі табе цяжка, заўсёды напамінай сабе аб тым, што калі ты здасіся, лягчэй не стане».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Сабраўся мужык на рыбалку, а жонка яму:**
**— Адзявайся цяплей!**
**— Ты што? Красавік на дварэ!**
**— Ну, у мінулыя выхадны ты п'яны прынёс марожаную рыбу — я падумала, што ты на Поўнач рыбачыць лётаеш...**

— Доктар, як прайшла аперацыя?
— Яшчэ ніяк, але калі вы не спіце, прытрымайце сціскач вось тут.



***Наступны нумар газеты выйдзе ў пятніцу, 10 мая.***

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.744. Індэкс 63850. Зак. № 1079.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 мая 2024 года.